УДК 141.2:17.021.2

# КРУГЛЫ СТОЛ, ПРЫСВЕЧАНЫ КНІЗЕ Ж.-Л. НАНСІ «БЫЦЦЁ АДЗІНКАВАЕ МНОЖНАЕ»

***Я. В. МАЛЫШКІН***[1*]***, А. А. ПАГРАБНЯК***[1*]***, Ю. Ю. ГАФАРАВА***[2*]

[1*]*Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*Універсітэцкая набярэжная, 7/9, 199034, г. Санкт-Пецярбург, Расія*
[2*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

У чэрвені 2019 г. у г. Полацку (Беларусь) у рамках сумеснага беларуска-расійскага даследчага праекта «Размеркаванне ведаў у сеткавым грамадстве: узаемадзеянне архаічных і сучасных формаў» адбыўся круглы стол, прысвечаны працы вядомага французскага філосафа Ж.-Л. Нансі «Быццё адзінкавае множнае» (*Être singulier pluriel*, 1996). Ключавое паняцце гэтага праекта – размеркаваныя веды – добра высвятляецца з дапамогай таго, што Ж.-Л. Нансі называе *з*-, або *сит*-. Тлумачачы суаднесенасць тэксту французскага філосафа з абранай даследчай перспектывай, удзельнікі круглага стала пашыраюць кантэкст ужывання такіх паняццяў, як кантынгентнасць, размеркаванасць, *Mitsein*, імкнуцца адпавядаць прэтэнзіі, выказанай у кнізе Ж.-Л. Нансі: пера(за)пісаць першую філасофію.

***Ключавыя словы:*** размеркаванасць; размеркаваныя веды; кантынгентнасць; *Mitsein*; першая філасофія.

***Падзяка.*** Даследаванне праводзілася пры фінансавай падтрымцы БРФФД-РФФД у рамках выканання навуковага праекта «Размеркаванне ведаў у сеткавым грамадстве: узаемадзеянне архаічных і сучасных формаў» (№ Г18Р-181, № 18-511-00018 Бел_а).

# КРУГЛЫЙ СТОЛ, ПОСВЯЩЕННЫЙ КНИГЕ Ж.-Л. НАНСИ «БЫТИЕ ЕДИНИЧНОЕ МНОЖЕСТВЕННОЕ»

***Е. В. МАЛЫШКИН***[1)]***, А. А. ПОГРЕБНЯК***[1)]***, Ю. Ю. ГАФАРОВА***[2)]

[1)]*Санкт-Петербургский государственный университет,*
*Университетская набережная, 7/9, 199034, г. Санкт-Петербург, Россия*
[2)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

В июне 2019 г. в г. Полоцке (Беларусь) в рамках совместного белорусско-российского исследовательского проекта «Распределение знания в сетевом обществе: взаимодействие архаических и современных форм» состоялся круглый стол, который был посвящен работе известного французского философа Ж.-Л. Нанси «Бытие единичное множественное»

**Образец цитирования:**
Малышкін ЯВ, Пparticular Паграбняк АА, Гафарава ЮЮ. Круглы стол, прысвечаны кнізе Ж.-Л. Нансі «Быццё адзінкавае множнае». *Журнал Белорусского государственного университета. Философия. Психология*. 2020;1:15–22.

**For citation:**
Malyshkin EV, Pogrebniak AA, Gafarova JJ. Round table on J.-L. Nancy’s book «Being singular plural». *Journal of the Belarusian State University. Philosophy and Psychology.* 2020; 1:15–22. Belarusian.

**Авторы:**
***Евгений Витальевич Малышкин*** – доктор философских наук, доцент; профессор кафедры теории и методики преподавания искусств и гуманитарных наук факультета свободных искусств и наук.
***Александр Анатольевич Погребняк*** – кандидат экономических наук, доцент; доцент кафедры проблем междисциплинарного синтеза в области социальных и гуманитарных наук факультета свободных искусств и наук.
***Юлия Юрьевна Гафарова*** – кандидат философских наук, доцент; доцент кафедры социальной коммуникации факультета философии и социальных наук.

**Authors:**
***Evgenii V. Malyshkin***, doctor of science (philosophy), docent; professor at the department of theory and methodology for teaching arts and humanities, faculty of liberal arts and sciences.
*malyshkin@yandex.ru*
***Aleksandr A. Pogrebniak***, PhD (economics), docent; associate professor at the department of problems of interdisciplinary synthesis in the field of social sciences and humanities, faculty of liberal arts and sciences.
*aapogrebnyak@gmail.com*
***Julia J. Gafarova***, PhD (philosophy), docent; associate professor at the department of social communication, faculty of philosophy and social sciences.
*gafarova@tut.by*
*http://orcid.org/0000-0003-0034-7066*

(*Être singulier pluriel*, 1996). Ключевое понятие проекта – распределенное знание – хорошо проясняется с помощью того, что Ж.-Л. Нанси называет *с*-, или *cum*-. Разъясняя соотнесенность текста французского философа с выбранной исследовательской перспективой, участники круглого стола расширяют контекст употребления таких понятий, как контингентность, распределенность, *Mitsein*, стараясь соответствовать претензии, высказанной в книге Ж.-Л. Нанси: пере(за)писать первую философию.

***Ключевые слова:*** распределенность; распределенное знание; контингентность; *Mitsein*; первая философия.

***Благодарность.*** Исследование проводилось при финансовой поддержке БРФФИ-РФФИ в рамках выполнения научного проекта «Распределение знания в сетевом обществе: взаимодействие архаических и современных форм» (№ Г18Р-181, № 18-511-00018 Бел_а).

# ROUND TABLE ON J.-L. NANCY'S BOOK «BEING SINGULAR PLURAL»

***E. V. MALYSHKIN***[a]***, A. A. POGREBNIAK***[a]***, J. J. GAFAROVA***[b]

[a]*Saint Petersburg State University, 7/9 Universitetskaya Embankment, Saint Petersburg 199034, Russia*
[b]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*
*Corresponding author: J. J. Gafarova (gafarova@tut.by)*

In June 2019, in the city of Polack (Belarus), as part of the bilateral Belarus – Russian research project «Distribution of knowledge in a network society: the interaction of archaic and modern forms», a round table was held. It was devoted to the text of the famous French philosopher J.-L. Nancy «Being singular plural» (*Être singulier pluriel*, 1996). The key concept of the project which is distributed knowledge, is well defined with what J.-L. Nancy calls *cum*-. Explaining the consistency of the J.-L. Nancy's text with the chosen research perspective, the round table participants expand the context of the use of concepts such as contingency, distribution, *Mitsein*, trying to comply with the claim of J.-L. Nancy's book wich is (re)writing first philosophy.

***Keywords***: distribution; distributed knowledge; contingency; *Mitsein*; first philosophy.

***Acknowledgements.*** The study was conducted with the financial support of the Belarusian Republic Foundation for Fundamental Research and the Russian Foundation for Fundamental Research in the framework of the scientific project «Distribution of knowledge in a network society: the interaction of archaic and modern forms» (No. Г18Р-181, No. 18-511-00018 Бел_а).

**Яўген Малышкін:** Калі дазволіць якому-небудзь меркаванню авалодаць табой, то апынаешся ў нейкім адмысловым вакууме: кожная значная падзея разгортваецца па загадзя вядомым сцэнарыі, але менавіта такая татальнасць і не дае меркаванню спраўджвацца. Даследчык аказваецца пазбаўленым свайго асноўнага інструмента – адрознення. Сустракаешся з нематой і прымусовай бяздзейнасцю. Таму ўсялякае сустрэчнае меркаванне аказваецца не толькі прадметам для пярэчання або згоды, але і благадаццю. З развіццём праекта, прысвечанага размеркаваным ведам, амаль такая гісторыя і выйшла. І кнігай, якая вывела мяне з вакууму паглынання, стала менавіта «Быццё адзінкавае множнае» Ж.-Л. Нансі. Ён выклаў думкі так, што лёгка згубіцца ў напісаным. І адзіны спосаб захаваць тут размеркаванасць, спагаду – чытаць уважліва, адсочваць уздымы і спады думкі як аўтара, так і свае, прызнавацца ў непрыманні, неразуменні ці нязгодзе, такіх жа кантынгентных, як і сама сустрэча з кнігай.

Кантынгентнасць сустрэчы – амаль цэнтральнае паняцце ў спробе думаць аб размеркаванасці ведаў. Аднак сёння мне б хацелася яе зрабіць не прадметам, але інструментам рэфлексіі над тым, што было прачытана. Кантынгентнасць ужо маецца (нам пашанцавала), у нас ёсць кніга, якую варта і чытаць, і перачытваць, і гэта можа стаць прадметам разважанняў. Няма і ніколі не было такога, каб мы думалі самі і толькі самі. Адмовіцца ад субстантывацыі, пакінуць тое, што нам спадарожнічае і рухаецца наперад разам з намі, кантынгентным – вось тая задача, якая здаецца мне і немагчымай, і па-сапраўднаму цяжкай.

**Юлія Гафарава:** Яўген, хачу адзначыць надзвычайную дарэчнасць выкарыстання паняцця «кантынгентнасць» у размове аб Ж.-Л. Нансі. З аднаго боку, сапраўды можна сказаць, што ў нашай сітуацыі кантынгентнасць існуе ў тым сэнсе, што нам пашанцавала, адбыўся нейкі збег абставін, камплементарная датычнасць, *канстэляцыя* ў гадамераўскім сэнсе слова. З другога ж боку, кантынгентнасць можа ўсведамляцца як адсутнасць неабходнай значнасці ў падставах нашых філасофскіх пазіцый, што дапамагае нам разумець і цярпліва прымаць прэтэнзіі Ж.-Л. Нансі.

**Я. М.:** Так, кніга Ж.-Л. Нансі пачынаецца з яркай прэтэнзіі: «Гэты тэкст не хавае амбіцыі перарабіць усю "першую філасофію", забяспечваючы яе ў якасці

падставы, "адзінкавым множным" быцця»[1] [1, с. 11]. У гэтай фразе два словазлучэнні ў двукоссі. Першае – цытата з Арыстоцеля, але ў двукоссі яно, хутчэй, таму што, калі думаць, як прапануе Ж.-Л. Нансі, ніякай першай філасофіі ўвогуле няма. Другое цытуе ключавую канструкцыю, якая вынесена на вокладку. Калі ўсякі сэнс даецца нам у нейкай сумеснасці і важна, якая менавіта гэта сумеснасць, то пытанне аб першым прынцыпе, прыроджанай ідэі або *Першым*, што мысліцца ва ўзгодненасці арыстоцелеўскіх пачаткаў і прычын, папросту не можа быць пастаўлена. Дакладней кажучы, «гэта не азначае, што… варта адвесці *Mitsein* месца нейкага "прынцыпу", якое прызначалася б яму. Мабыць, су-быццё "ў прынцыпе" пазбягае і завяршэння, і пазіцыі прынцыпу» [1, с. 147]. Зразумелы пачатак апынецца ў нейкай кампаніі. Мы павінны звярнуць увагу не на якасную, а на колькасную вызначанасць гэтай кампаніі. Гэта значыць, пытанне аб *Першым*, наколькі яно наогул існуе, не павінна гучаць так: «Чым ёсць тыя, хто ведае нешта першае?» Гэта не пытанне аб суб'екце, які клапоціцца пра сябе ці пра сабе падобных. Такое пытанне папросту адцягвала б увагу ад прадмета і стварала ў нас ілюзію прыналежнасці да суполкі, якая прэтэндуе на небывалую ўстойлівасць і перавагу ў параўнанні з папярэднікамі і суседзямі. Пытанне, наадварот, павінна стаяць так: «Калі тых, з кім мы здольныя абмяркоўваць па-сапраўднаму цікавае, так няшмат і нам так лёгка страціць суразмоўцу, то якія межы мае наша абмеркаванне, папросту: колькі нас?» Таму што, калі высветліцца, што нас неабсяжная колькасць ці што наш суразмоўца ўнікальны, гэта будзе значыць, што мы зрабілі метадалагічную памылку, прынялі прыватную размеркаванасць ведаў за ўсеагульную або адзінкавую.

Але гэта пытанне, відавочна, не столькі прадметнае, колькі метадалагічнае. Ці не адмаўляемся мы тым самым ад прадмета, яшчэ не задаўшы пра яго пытанне? Ж.-Л. Нансі пераказвае гэту ўстаноўку так: «Пачатак – гэта сцвярджэнне; паўтор жа ёсць умова сцвярджэння» [1, с. 22]. Тады што значыць ісці за Ж.-Л. Нансі або (זоймем заведама наіўную пазіцыю атаясамлівання) думаць аб размеркаваных ведах? Прэтэнзія на перапрацоўку першай філасофіі рассыпаецца па ходзе чытання кнігі. Ж.-Л. Нансі не прапануе ні нейкай асаблівай даследчыцкай праграмы, ні пэўнай метадалогіі. Яго кніга – гэта зборнік удалых апавяданняў аб тым, што ён называе то адзінкавым множным быцця, то ўвагай да *з-*, то першапачатковай тэматызацыяй *Mitsein*, а мы, паўтаруся, – размеркаванасцю ведаў.

**Ю. Г.:** Сапраўды, прэтэнзія Ж.-Л. Нансі з'яўляецца надзвычай яркай, дзёрзкай, аднак наўрад ці абгрунтаванай. Услед за К. А. Сяргеевым можна сцвярджаць, што ў XV ст. у заходнееўрапейскай традыцыі вызначыліся два падыходы да праблемы суб'екта. Першы з іх – перспектыўнае мысленне, якое было арыентавана на апярэджанне і звязана з магіка-герметычнай традыцыяй (халістычны праект Мікалая Кузанскага), другі – перспектыўна-эўрыстычнае мысленне, якое было выклікана станаўленнем новай механістычнай навукі (сцыентысцкі праект Л. Альберці) [2, с. 61–78]. І калі другі падыход вылучае суб'екта, што пазнае (Ж.-Л. Нансі называе яго прымітыўнай індывідуальнай дадзенасцю [1, с. 76]), то першы, які развівае неаплатанічную канцэпцыю злучэння ў *Адзіным* бясконцага бога і свету канечных рэчаў, для характарыстыкі крыніцы ведаў звяртаецца да актуальнай бясконцасці [3]. Абодва падыходы прысутнічаюць у рэнесансным антрапацэнтрызме амаль невыразна, толькі як тэндэнцыі. Халістычная тэндэнцыя не зрабілася філасофскім мэйнстрымам, але тым не менш развівалася на працягу ўсёй гісторыі заходняй філасофіі і выступала ў якасці пантэізму Б. Спінозы, манадалогіі Г. Лейбніца, хайдэгераўскага «эскіза» анталогіі *Mitsein*, гэта значыць усіх вучэнняў, якія супрацьстаялі таму, што Ж.-Л. Нансі акрэсліў як «саліпсічную эгалогію» [1, с. 76].

Зрэшты, Ж.-Л. Нансі і сам прызнае, што пытанне пра быццё адзінкавае множнае «задавалася не раз даўняй традыцыяй, якая паходзіць з манадалогіі Г. Лейбніца, а таксама з традыцыі, якая мае справу з рознымі формамі "першапачатковага падзелу", а ў яшчэ больш шырокім сэнсе – з любымі формамі адрознення адзінага ў ім самім і дзеля яго самога» [1, с. 69]. Што на самай справе важна, і тут мы можам пагадзіцца з Ж.-Л. Нансі, дык гэта «сам паўтор: канцэнтраванне і паглыбленне пытання» [1, с. 70].

Што ж тады азначае выраз: «Ісці за Ж.-Л. Нансі»?

**Я. М.:** Відаць, рабіць тое ж, што робіць ён: збіраць удалыя апавяданні. Уласна кажучы, філасофія такая з часоў Платона: адзіны сталы яе прадмет – яна сама, тое самае аднаўляльнае намаганне, якое і называецца філасофіяй. Калі наш круглы стол стане зборам выказванняў, апавяданняў аб размеркаваных ведах, падобным да таго, які мы спазналі ў кнізе Ж.-Л. Нансі, я палічу яго надзвычай удалым *з-дарэннем*.

Праўда, філасофія з самага пачатку – не што іншае, як высвятленне, што ўяўляюць сабой рэчы, якія ўтрымліваюць нас разам. Яно не можа быць бязбольным, а неабходнасць адукацыі, прывілеяванае становішча філасофіі ў параўнанні з усімі іншымі навукамі і мастацтвамі, яе школы і пераемнасць – усё гэта не больш чым спроба гэту балючасць, вельмі непрыемную і разбуральную, згладзіць. Мне б хацелася ў сувязі з гэтым успомніць абвінавацаў Сакрата, Аніта і Мялета, якія патрабавалі яго смерці, здавалася б, за не такое вялікае злачынства: адлучэнне маладых ад веравання ў бацькоў

[1] Тут і далей пераклад наш. – *Ю. Г.*

і ўважлівасць да боскага, змену яго імёнаў, вынаходніцтва новых.

Пра Сакрата нам вядома, што, дамагаючыся «другога нараджэння» суразмоўцаў, ён здзекаваўся з іх часам вытанчана («Гіпіяс большы»), часам – як атрымлівалася («Парменід»). Гэтыя здзекі былі патрэбныя, каб прымусіць не пераказваць гатовае, а кожны раз нанова сустракацца з думкай і суразмоўцамі, без якіх меркаванне не спраўдзіцца.

Але здзекі гэтыя, хоць і метадычна вывераныя, па-першае, шкодзяць становішчу поліса, а па-другое, зусім нічога не гарантуюць і самі не ёсць гарантаванымі: яны доўжацца, пакуль існуе Сакрат, і гэта ўсё, што можна сказаць пра іх анталагічны статус, а ці прывядуць яны да ўдалай размовы, да самастойнага выказвання – невядома. Але дзеля чаго тады ўся гэта галеча, клапы [4, с. 176], боль і прыніжэнне? Сам па сабе ж Сакрат і яго занятак няважныя. Нічым не гарантаванае «нараджэнне», якое, у сваю чаргу, таксама можа нічога не прынесці, выступае супраць парадку ў полісе і шанавання багоў. Больш за тое, пазіцыя Сакрата нават горшая, бо яго мэты, «нараджэння чалавека», можна дасягнуць і іншымі сродкамі, тады як ён па незразумелай прычыне заўсёды прытрымліваецца адной і той жа стратэгіі. І калі асяроддзе Сакрата разрастаецца, ён становіцца аўтарытэтным літаральна на пустым месцы, а таму – нязносным.

Аніт, Мялет і Лікон задаюцца такім самым пытаннем: «Чым ты займаешся, Сакрат, што гэта? Памры ці адказвай». Сакрат жа паводзіць сябе дакладна як Ж.-Л. Нансі: распавядае гісторыі, вызывае суразмоўцаў, удалых і не вельмі, і зноў справа не абыходзіцца без здзекаў і жартаў. Можна зразумець і абвінаваўцаў, і суддзяў. З тых часоў пытанне пра тое, як уладкоўваюцца размеркаваныя веды, як мы бачым, прасунулася недалёка, хіба што вынаходніцтва абвінаваўцаў Сакрата – падзяліць паміж сабой магчымы пройгрыш, каб не сплачваць ладную суму ў адзіночку, – вельмі ўдасканалілася.

**Аляксандр Паграбняк:** У мяне пытанне: «Па-сапраўднаму цікавае – гэта абавязкова асаблівае?» Не бывае цікавага адзінкавага або ўсеагульнага? Чаму толькі некаторыя, не адзін і не ўсе, з'яўляюцца цікавымі?

**Я. М.:** Сама гэта трыяда (*адзінкавае – асаблівае – усеагульнае*), вядома, узята не з мовы Ж.-Л. Нансі, не з мовы *з-*. Па-сапраўднаму цікавым топасам я б назваў такі, у якім мы не толькі зафіксавалі ўласную цікавасць, але і вяртаемся да дзейнасці ў поле, што цікавіць нас, але самі ўжо пастаўлены пад сумненне. Сустрэўшыся з разуменнем, мы вымушаны здзяйсняць крокі, пра магчымасць якіх не меркавалі, насуперак свайму жаданню. Узорным дзеяннем тут аказваецца вайна, менавіта яе Ж.-Л. Нансі і разглядае, падводзячы высновы ў кнізе, як бы паказваючы, як працуе машына дыскурсу размеркаванасці. На вайне рашэнне апярэджвае разуменне, але так выглядае і любая захапляючая размова. Гэта адзін модус праблематычнага.

Другі яго модус – гэта адзінкавае і ўсеагульнае, якія з'яўляюцца праблематычнымі для размеркаванага. Адзінкавая размеркаванасць – амаль аксюмаран. Нельга сказаць, што не бывае думак, якія прыходзілі толькі аднойчы, або краявідаў, якія толькі аднойчы былі ўбачаны. Але і супрацьлеглае сцвярджаць таксама цяжка, бо сама канстатацыя ўнікальнасці памнажае магчымасць яе размеркаванасці. Адзінкавае і ўсеагульнае – маргіналы дыстрыбутыўнасці. Як усеагульная размеркаванасць можа складаць прадмет клопату, падобна да таго, як мы клапоцімся пра тое, каб усе выконвалі правілы дарожнага руху або казалі праўду, так і адзінкавае, унікальнае, мае патрэбу ў штодзённым паказе ўцёкаў ад паўтарэння. Клопат ніколі не заканчваецца – гэта якраз выпадак поўнай, усеагульнай размеркаванасці, але не пазітыўнай, а негатыўнай. Тут добрым прыкладам будзе крытыка А. Макінтайрам кантаўскага катэгарычнага імператыва [5, с. 66]: адмоўная ўсеагульная дыстрыбутыўнасць закону прыводзіць і да недакладнасцей у яго фармулёўцы, і да бязглуздзіцы.

У выніку, адказваючы на пытанне, трэба проста сказаць, што па-сапраўднаму цікавае можа тычыцца любога аб'ёму паняцця, аднак дыстрыбутыўнасць такой цікавасці заўсёды асаблівая і важна ўдакладняць, наколькі, якія межы супольнасці і які кошт уваходжання ў яе. Змешваць гэтыя два модусы – аб'ёму паняцця і размеркаванасці – лёгка, і мы часта гэта робім. Напрыклад, ідэя сталага росту эканомікі здаецца несупярэчлівай. Цяжкасці з'яўляюцца, як толькі ўзнікае пытанне пра тое, дзеля каго гэты рост, колькі ўдзельнікаў хуткарослай эканомікі. Тут мы сутыкнёмся і з дэскрыптыўнымі, і з прадказальнымі перашкодамі ўжывання гэтага канцэпту.

**А. П.:** Яўген, на мой погляд, выказаў два важныя моманты, на якія я хацеў бы звярнуць увагу: па-першае, кантынгентнасць у якасці не прадмета, але інструмента рэфлексіі («Кантынгентнасць сустрэчы – ледзь не цэнтральнае меркаванне ў спробе думаць аб размеркаванасці ведаў»); па-другое, пытанне аб межах абмеркавання таго, што па-сапраўднаму цікава, пытанне аб тым, колькі нас. Відавочна, што гэтыя моманты ўзаемазвязаныя, і можна палічыць, што ў іх утрымліваецца ненаўмысная расшыфроўка назвы кнігі Ж.-Л. Нансі «Быццё адзінкавае множнае». Быццё, па Нансі, – гэта заўсёды экспанаванне існых адзін аднаму, і яно ніколі не з'яўляецца абгрунтаваным у сутнасці, у субстанцыяльным складзе таго ці іншага існага. У гэтым сэнсе быццё цікавае, яно і ўяўляе сабой *inter-esse*, калі існыя, выступаючы насустрач адзін аднаму, утвараюць супольнасць і падзяляюць сэнс (пры гэтым зноў-такі сэнс не папярэднічае падзелу, але толькі

ў ім і існуе). Вось як пра гэта кажа сам Ж.-Л. Нансі: «Цэлае існага ёсць уласная прычына, і няма ў яго ніякай іншай. Гэта не азначае, што яно – свой прынцып і свая мэта, паколькі не з'яўляецца "сабой". Яно ёсць яго ўласнай дыспазіцыяй і множнасцю адзінкавасцей. Гэта *быццё* выказваецца як нейкае *паміж* і нейкае *з-* адзінкавых. *Быць, паміж* і *з-* – адно і тое ж... тое, што не можа быць прадстаўлена як існае сярод іншых, паколькі гэта "сярод" усіх існых (сярод: унутры, усярэдзіне, *з*-), якія кожны раз існуюць адны сярод другіх» [1, с. 135–136].

Менавіта таму быць самім, па Нансі, не значыць быць індывідам, але значыць быць *да сябе*, і гэта *да* і ёсць (ніколі не-)першапачатковая самасць, доказам чаго служыць фактычнасць мовы, вопыт якой – заўсёды дыялог, хай нават у форме балбатні [1, с. 137].

У іншай сваёй працы «Бяздзейная супольнасць» (*La commupauté désoeuvrée*, 1986) Ж.-Л. Нансі вызначаў само быццё як стаўленне і (*не)абсалютнасць* і ў гэтым сэнсе – як *супольнасць*, а таксама як *экстаз*, гэта значыць «выраз немагчымасці абсалютнасці абсалюту, або, інакш кажучы, "абсалютнай" немагчымасці завершанай іманентнасці». Ён (экстаз) «адназначна фіксуе як анталагічную, так і гнасеалагічную немагчымасць абсалютнай іманентнасці (або абсалюту, значыць, іманентнасці) і, такім чынам, як індывідуальнасці, так і чыстай калектыўнай усеагульнасці ў сапраўдным сэнсе. Тэма індывіда і тэма камунізму звязаны ў агульнай праблематыцы іманентнасці. Яны сугучныя ў агульным адмаўленні экстазу. З гэтага часу пытанне супольнасці неаддзельнае ад пытання пра экстаз: гэта значыць, як можна зразумець, ад пытання пра быццё, якое разглядаецца інакш, чым абсалют сукупнасці існых» [6, с. 30–31]. Менавіта таму сустрэча, якая з'яўляецца, відавочна, сэнсам экстазу – гэта сітуацыя, дзе заўсёды здараецца многае, але адзінкавым, унікальным, характэрным чынам. Быццё адначасова адзінкавае і множнае, а не індывідуальнае ці калектыўнае (камуністычнае). Вядома, нельга сказаць, што ў гэтай думцы Ж.-Л. Нансі будзе абсалютным першапраходцам, вось, напрыклад, цытата з працы «Лібідыяльная эканоміка» Ж.-Ф. Ліятара: «Калі кажуць адразу, маецца на ўвазе не толькі *абодва* (ці *n*) *разам*, але і *за раз*, у адзінкавасці *гэтага* разу, *della volta*» [7, с. 34]. Аналогія з пазіцыяй Ж.-Л. Нансі поўная, але менавіта апошні прэтэндуе на тое, каб на падставе згаданага тэзіса перагледзець першую філасофію. І гэты перагляд, магчыма, звязаны са спробай прыдумаць іншае стаўленне да пытання «колькі?». Невыпадкова ж апошняе эсэ («Чалавечая празмернасць»), якое ўвайшло ў кнігу «Быццё адзінкавае множнае», прысвечана феномену вялікіх лічбаў.

Такім чынам, быццё ў сваім сэнсе ёсць заўсёды ўжо *су-быццё* і *паміж-быццё*, або проста *з-* і *паміж-*, гэта значыць не столькі *гарызонт* існага (які адразу ж падпарадкоўвае яго апазіцыі *іманентнае – трансцэндэнтнае*, іх дыялектыцы), колькі яго асяродак. Гэта, напэўна, дазваляе нам сказаць, што быццё існага – гэта яго (існага) размеркаванасць. Адзначым, што нельга сцвярджаць, што ёсць нейкае існае, якое потым трэба яшчэ размеркаваць (хоць менавіта так выглядаюць нашы разнастайныя практыкі абыходжання з ім, напрыклад палітыка, накіраваная на ажыццяўленне ідэалаў сацыяльнай ці, наадварот, рынкавай справядлівасці), але так, што яно само (гэта існае і веданне пра яго) адразу ж дадзена як факт размеркавання. Таму адзінкавае і множнае не павінны (хоць і могуць) рэдукавацца адзін да аднаго, такая рэдукцыя прывядзе да адчужэння *з-*: «Перапоўніць некаторае *з-* можна, запаўняючы або спусташаючы яго: можна прыпісваць яго да падставы паўнаты і бесперапыннасці ці да бездані непераходнасці. У першым выпадку адзінкавае становіцца прыватным нейкай сукупнасці. І з гэтага часу яно ўжо і не адзінкавае, і не множнае. У другім выпадку адзінкавае існуе толькі асобна ад *сам*, а значыць як сукупнасць, і яно зноўтакі не з'яўляецца ні адзінкавым, ні множным» [1, с. 143–144].

Гэта разважанне ставіць пад сумненне прэтэнзію каштоўнасных (вартасных) адносін на вызначэнне першапачатковай структуры нашага вопыту. Такое стаўленне можа быць абумоўлена пытаннем: «Колькі трэба здзейсніць пераходаў (прамежкавых крокаў), каб дасягнуць нейкага выніковага, ужо больш не пераходнага стану?» Менавіта так разумеў каштоўнасць Ж.-П. Сартр: як сімвалічны характар усялякага акта прысваення, які спрабуе ўвасобіць тоеснасць *у-сабе* і *для-сябе*, дзе суб'ект мог бы авалодаць уласнай асновай. Але гэта спроба аказваецца марнай: «У выніку, як можна было прадбачыць, дастаткова аддаць грошы, каб ровар належаў мне, але патрэбна ўсё маё жыццё, каб рэалізаваць гэта ўладанне... валоданне з'яўляецца прадпрыемствам, якое смерць пакідае заўсёды незавершаным» [8, с. 595]. Ёсць толькі канчатковая серыя пераходных станаў у спробе самому зацвердзіць сябе, потым адразу ж пачынаецца бездань непераходнасці, без усялякага *сам*. Аналагічнай з'яўляецца і логіка капіталу, які Ж.-Л. Нансі вызначае ў якасці «адчужэння адзінкавага множнага быцця як такога», калі адзінкавае і множнае супрацьпастаўляюцца як «індыферэнтная і перамежная партыкулярнасць вытворчай адзінкі» і «сетка тавараабароту» [1, с. 119]. Гэта ўзаемнае дапушчэнне адчужанага частковага працаўніка і фетышызаванай множнасці таварнага свету і ляжыць у аснове капіталу як дыспазітыва, які тым не менш захоўвае адсылку да быцця як да дыспазіцыі існых: «Незлічоная "прыбавачная вартасць", "вартасць" як бясконцае, кругавое і самамэтавае ўзрастанне выстаўляе напаказ недасягальнасць першапачатковай або канчатковай "вартасці" і ў выніку адкрыта, парадаксальным і жорсткім чынам ставіць пытанне пра нешта, што "не мае кошту"

(*hors-valeur*), ці пра "абсалютную вартасць", якую немагчыма вымераць, а значыць, пра нешта, што не мае кошту (пра тое, што І. Кант называў "годнасцю")» [1, с. 120]. У гэтым сэнсе можна сказаць, што капітал увасабляе метафізічнае намаганне перадолець кожную рэшткавую фізічнасць чалавечага быцця, і сёння гэта намаганне набыло форму практыкі татальнага менеджменту, які ператварае ўсе заняткі (мастацтва, адукацыя, каханне і г. д.) у разнавіднасці дзелавога прадпрыемства, якія канкуруюць (акселерацыяналізм, бліскуча прадстаўлены ў тэкстах Н. Ланда). Ж.-Л. Нансі ў сувязі з гэтым кажа, што мадальнасць *з-* (*сит-*) сутыкаецца тут з мадальнасцю *транс-* (што, у прыватнасці, даказваецца багаццем тэрмінаў тыпу *транспарт*, *трансакцыя*, *трансфер*, *трансфармацыя* і іншых варыяцый на тэму *трансцэндэнцыі*). *Транс-* і *з-* пераплецены паміж сабой, і ўсё ж іх варта адрозніваць: першае прадугледжвае ў якасці ідэалу тоеснасць сябе і іншага, «су-быццё, наадварот, азначае іншага, які ніколі не вернецца да тоеснаснага, множнасць вытокаў» [1, с. 129]. Мадальнасць *транс-* ператварае вопыт існавання ў бесперапыннае выгнанне, калі стаўленне да сябе аказваецца «спрадвечна апранутым у жалобу» [1, с. 125], а каханне – «"клопатам" аб тым, што спрадвечна выпадае з-пад увагі, або тым, чаго бракуе» [1, с. 127]. Такім чынам, анталогія нашага сумеснага быцця аказваецца анталогіяй дэфіцыту. У процілегласць гэтаму, «*не будучы ні "каханнем", ні нават наогул "сувяззю" і ўжо тым больш ні су-паложнасцю абыякавасцей, з- з'яўляецца ўласным рэжымам множнасці вытокаў, з якіх яны выходзяць*, не адны з адных, не адны для іншых, але *адны з прычыны іншых альбо у-адносінах-да-іншых*» [1, с. 131].

На мой погляд, апошняе сцвярджэнне ў згорнутым выглядзе змяшчае тое галоўнае, чаму прысвечана кніга «Быццё адзінкавае множнае». Уласна кажучы, адзінае, што адбываецца ў кнізе, – гэта цыркуляцыя згаданай тэзы, яе герменеўтычнае кружэнне ў розных сферах вопыту, дзякуючы чаму філасофскі трактат, больш за тое – сачыненне, якое прэтэндуе быць трактатам па першай філасофіі, ператвараецца, як трапна заўважыў Яўген, у збор удалых апавяданняў. Менавіта таму хочацца зрабіць спробу патлумачыць ключавую тэзу кнігі Ж.-Л. Нансі такім чынам, пра які, як мне здаецца, сама яна і заяўляе як пра (не)першапачатковы спосаб быць і думаць. Інакш кажучы, я хачу разгарнуць гэту тэзу з пункта гледжання (яшчэ аднаго) вартага ўвагі апавядання, якое, не ведаючы таго, аказваецца ў дадзены момант размеркаваным у суполку нас, навукоўцаў, якія размаўляюць пра Ж.-Л. Нансі («Цябе куды размеркавалі?» – пыталіся адзін у аднаго ў савецкія часы выпускнікі навучальных устаноў; «Мы жывём не ў грамадстве спажывання, а ў грамадстве размеркавання», – пісаў А. Бітаў у «Пушкінскім доме»). Я маю на ўвазе апавяданне (у тым ліку і ў афіцыйным літаратуразнаўчым сэнсе слова) Ю. Казакова «Праклятая поўнач». На фармальнае пытанне: «Пра што апавяданне?» – можна адказаць, што яно пра няўдалую спробу двух маракоў паўночнага флоту, якія апынуліся ў адпачынку ў Ялце, добра правесці час. Ці ўсё ж такі пра ўдалую? Апавяданне, вядома, не паддаецца адназначнаму тлумачэнню, яго сэнс не так лёгка *транс*-партаваць. Адзначу толькі кульмінацыйны, на маю думку, момант. Вось героі аказваюцца ў рэстаране, за бутэлькай каньяку, а за суседнім столікам – маракі (паўднёвыя кабатажнікі, яны апрыёры выклікаюць у паўночнікаў пагарду), якія, не ведаючы, чым пацешыць сваіх дзяўчат (у нашых герояў ніякіх дзяўчат няма, толькі ўспаміны, ды і тое, у асноўным пра няўдачы), агучваюць «статыстыку кахання», згодна з якой у кожную хвіліну на зямным шары адбываецца тры мільёны пацалункаў. І гэта лічба раптам наганяе на галоўнага героя тугу: «Гэта была такая жудасная лічба, што неяк нават і не ўяўлялася нічога, нельга было ўсвядоміць, адчуць гэтыя пацалункі, якімі ў гэтую хвіліну займаліся дзесь у нас на вялікай прасторы, і ў Афрыцы, і ў Аўстраліі, і ў Польшчы… А прыгадваліся мне чамусьці дзікія фактары – усе, якія я бачыў на поўначы, выспы, чорныя базальтавыя скалы і ледзяныя купалы, якія сыходзяць у фіялетавае арктычнае неба, і смарагдавыя заломы ледніком, сінія цені ў расколінах, вечныя маўклівыя чайкі за кармой, уздыхі машын, жар у апраметных кацельнях, цесныя кубрыкі, каюты, паравое цяпло ў рубках, сіпатыя нізкія рыканні параходных гудкоў у тумане і безыменныя па ўсёй поўначы долкі, у якіх калеюць хлопцы, і гэтыя хлопцы ніколі нікога не пацалуюць… Усё гэта праходзіла паўз мяне, змешвалася, і было радасна, і холадна, і сумна адначасова» [9, с. 132–133].

Туга суіснуе з радасцю, як і холад – з патройным цяплом Ялты, рэстарана, каньяку, жывыя чайкі – вечныя і маўклівыя, мёртвыя машыны ўздыхаюць, тое, што праходзіць, не выбудоўваецца ў паслядоўнасць, а змешваецца, пра радасць гаворыцца адразу ж услед за тым, як шырокі спіс паўночных успамінаў даходзіць да долак, дзе калеюць хлопцы, якія ніколі нікога не пацалуюць. Уся справа ў тым, што менавіта адмеранай бясконцасці пацалункаў, адным з якіх у гэтую хвіліну павінен «займацца дзесь у нас на вялікай прасторы» і ты (інакш кажучы, нарматыўнасці адпачынку, шчасця, удачы, поспеху і г. д.), відавочным чынам супрацьпастаўляецца «канечнасць, якая сама бязмерная», а таксама адказнасць, што заключаецца ў тым, што не трэба «суадносіць сябе з якой-небудзь нарматыўнай інстанцыяй» [1, с. 270]. Адштурхоўваючыся ад «жудаснай лічбы», герой Ю. Казакова па-свойму адаптуе тэзу Ж.-Л. Нансі: «Памер чалавецтва становіцца неаддзельным ад яго годнасці» [1, с. 267]. Яшчэ раз

паўторым пытанне Яўгена: «У якой колькасці мы апынаемся, калі нас чакае нешта бязмернае: незлічоная прыбавачная вартасць, тры мільёны пацалункаў – прыкладаў такога роду безліч?».

**Ю. Г.:** Я б хацела задаць пытанне, якое дэталізуе граматыку гэтага *сит-*, або размеркаванасці. Калі размеркаванасць нерэлевантная вызначэнням кахання ў іўдзейска-хрысціянскім сэнсе, яна апынаецца па-за межамі як трансцэндэнтнага, так і іманентнага. Ці значыць гэта, што быццё адзінкавае множнае жыве па-за любоўю да іншага як да самога сябе, па-за каханнем як літасцю, спагадай?

**Я. М.:** Якое добрае пытанне! Я б хацеў удакладніць яго так: «Што, любоўныя *пера*-жыванні цяпер, пасля выхаду кнігі Ж.-Л. Нансі, ужо не ў модзе?» Але, гаворачы пра бязмернасць прыбавачнай вартасці і «жудасную лічбу» пацалункаў, хіба мы не вяртаем гэту самую канцэпцыю трансцэндэнтнасці толькі пад іншым імем? З дапамогай гэтых пытанняў мы пазбавімся і ад дакучлівасці радкоў Ф. Цютчава, якія не ідуць у мяне з галавы з пачатку выступлення Аляксандра: «Не дадзена прадбачыць нам, / Як слова наша адгукнецца, / І спачуванне нам даецца, / Як нам даецца благадаць» [10, с. 307]. Тут быццам бы гаворыцца пра саму сутнасць размеркаванасці, кантынгентнасць водгуку пераплятаецца з непазбежнасцю ўласнай уцягнутасці. А ўсё ж Фёдар Іванавіч гэта падабенства благадаці і спачування відавочна ўстанаўлівае адпаведна нейкай трансцэндэнтнай субстанцыі. Шлях спачування, спагады падобны да шляху веры, і ў гэтым пазітыў верша. Размеркаванасць жа, прынамсі ў выказванні Аляксандра, пабудавана інакш: трансцэндэнтнае заменена вялікай колькасцю вытокаў. Ва ўсякім разе я пачуў менавіта гэта проціпастаўленне.

**А. П.:** Усё дакладна так, і я спрабаваў выказаць менавіта думкі Ж.-Л. Нансі, выкарыстоўваючы тэкст яго кнігі: мноства вытокаў замест апазіцыі *трансцэндэнтнае – іманентнае*, менавіта так кажа сам аўтар. А бязмерная прыбавачная вартасць і «жудасная лічба» пацалункаў, вядома ж, канкрэтныя ўвасабленні той дакучлівай трансцэндэнтнасці, што Ж.-Л. Нансі супрацьпастаўляе сваю «першую філасофію» і антрапалогію, якая базіруецца на ёй. Згодна з апошняй, існінай чалавека з'яўляецца не нешта *транс-чалавечае*, але менавіта *са-чалавечае*, дзе, вядома ж, *чалавечае* і ўяўляе сабой гэтае *са-*, а не нейкую субстанцыю, якая толькі потым акцыдэнцыяльна ўступае ў адносіны з кімсьці і чымсьці. Выказванне, што любоўныя перажыванні больш не ў модзе, я б рызыкнуў удакладніць так, што Ж.-Л. Нансі аддае перавагу эпікурэйскаму правілу размеркавання «Венерынай вільгаці» паміж рознымі (нават разнастайнымі) аб'ектамі [11, с. 152], а не платонаўска-арыстоцелеўскаму разуменню любові як імкнення ўсяго існага да *Адзінага*, альбо *Розуму*. Эпікурэйскае правіла паўтаралася затым З. Фрэйдам у яго вядомай дэфініцыі шчасця як «праблемы гаспадарскага выкарыстання індывідуальнага лібіда» [12, с. 308], якое не рэкамендуецца цалкам змяшчаць у адзін «банк». У рэшце рэшт, твор «Праклятая поўнач» Ю. Казакова і вызначае менавіта такі кірунак гэтага згасання агню кахання, але не ў цынічна-ашчадным сэнсе («банк» адзінага кахання можа прагарэць, і што тады?), а ў сэнсе камуністычным: як умову магчымасці ператвараць каханне ў нейкую супольную справу (не ў эгаістычны запал валодання ці запісаную на яе вывараце мазахісцкую прагу поўнай самааддачы). Карыстаючыся тэрмінамі Дж. Агамбена, адзначым, што гаворка ідзе пра каханне як карыстанне, якое не суправаджаецца канстытуяваннем права ўласнасці – права ўсіх правоў, якое якраз і вызначае падзел свету на сваё і чужое, іманентнае і трансцэндэнтнае. У Ж.-Л. Нансі *з-* аналагічнае *спецыяльнаму* Дж. Агамбена ў іх агульным супрацьстаянні *транс-* і *персанальнаму*. «Спецыяльнае быццё чароўнае, – піша Дж. Агамбен, – таму што прапануецца перш за ўсё ў агульнае карыстанне, але не можа быць аб'ектам прыватнай уласнасці. Для персанальнага, наадварот, немагчымыя ні карыстанне, ні ўцеха, але толькі ўласнасць і рэўнасць» [13, с. 62]. І нарэшце, сапраўднае каханне і сапраўдныя палюбоўнікі, па Нансі (які тут абапіраецца на антыгегелеўскую інтуіцыю Ж. Батая), калі нечым і займаюцца, то толькі тым, што «выказваюць *par excellence* бяздзейнасць супольнасці», і нават нараджэнне дзіцяці зусім не здымае адрознення палюбоўнікаў, у духу Гегеля, але выносіць гэта адрозненне далей: дзіця «не завяршае кахання, а падзяляе яго па-новаму, дазваляе яму зноў увайсці ў камунікацыю і, акрамя таго, быць выказаным супольнасці» [6, с. 82]. Ж.-Л. Нансі супрацьпастаўляе такое разуменне кахання іўдзейска-хрысціянскай дактрыне, дзе хоць і гаворыцца пра блізкага, але на самай справе гаворка ідзе пра несувымернасць іншага, так што вымярэнне *з-* адначасова і з'яўляецца (бо блізкасць азначае *каля*, *дотык*), і знікае (паколькі «гэты іншы не ёсць *з-*, ён ужо ці ўсё яшчэ не *з-*, ён бліжэй і далей, чым любое быццё-разам») [1, с. 125–129].

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Нанси Ж-Л. *Бытие единичное множественное.* Минск: Логвинов; 2004. 272 с.
2. Сергеев К. *Ренессансные основания антропоцентризма.* Санкт-Петербург: Наука; 2007. 594 с.
3. Кузанский Н. О видении Бога. В: Кузанский Н. *Сочинения. Том 2.* Москва: Мысль; 1979. с. 33–95.
4. Аристофан. *Комедии. Фрагменты.* Москва: Ладомир; 2008. 1033 с. Совместно с издательством «Наука».

5. Макинтайр А. *После добродетели. Исследования теории морали.* Москва: Академический проект; 2000. 383 с.
6. Нанси Ж-Л. *Непроизводимое сообщество.* Москва: Водолей; 2009. 208 с.
7. Лиотар Ж-Ф. *Либидинальная экономика.* Москва: Институт Гайдара; 2018. 472 с.
8. Сартр ЖП. *Бытие и ничто. Опыт феноменологической онтологии.* Москва: Республика; 2000. 639 с.
9. Казаков ЮП. *Двое в декабре. Рассказы.* Москва: Молодая гвардия; 1966. 272 с.
10. Тютчев ФИ. *Полное собрание стихотворений.* Ленинград: Советский писатель; 1987. 563 с.
11. Тит Лукреций Кар. *О природе вещей*. Москва: Художественная литература; 1983. 383 с.
12. Фрейд З. *Художник и фантазирование.* Москва: Республика; 1995. 400 с.
13. Агамбен Д. *Профанации*. Москва: Гилея; 2014. 112 с.

## References

1. Nancy J-L. *Being singular plural*. Stanford: Stanford University Press; 2000. 230 p.
Russian edition: Nancy J-L. *Bytie edinichnoe mnozhestvennoe*. Minsk: Logvinov; 2004. 272 p.
2. Sergeev K. *Renessansnye osnovaniia antropotsentrizma* [Renaissance foundations of anthropocentrism]. Saint Petersburg: Nauka; 2007. 594 p. Russian.
3. Kuzanskii N. [The vision of God]. In: Kuzanskii N. *Sochineniya. Tom 2* [The works. Volume 2]. Moscow: Mysl'; 1979. p. 33–95. Russian.
4. Aristofan. *Komedii. Fragmenty* [Comedies. Fragments]. Moscow: Ladomir; 2008. 1033 p. Co-published by the «Nauka». Russian.
5. MacIntyre A. *After virtue: a study in moral theory*. Notre Dame: University of Notre Dame Press; 1981. 286 p.
Russian edition: MacIntyre A. *Posle dobrodeteli. Issledovaniia teorii morali*. Moscow: Akademicheskii proekt; 2000. 383 p.
6. Nancy J.-L. *The inoperative community*. Minneapolis: University of Minnesota Press; 1991. 224 p.
Russian edition: Nancy J-L. *Neproizvodimoe soobshchestvo*. Moscow: Vodolei; 2009. 208 p.
7. Lyotard JF. *Libidinal economy*. Bloomington: Indiana University Press; 1993. 275 p.
Russian edition: Lyotard JF. *Libidinal'naia ėkonomika*. Moscow: Institut Gaidara; 2018. 472 p. Russian.
8. Sartre JP. *Being and nothingness: an essay on phenomenological ontology*. Abingdon: Routledge; 1956. 688 p.
Russian edition: Sartre JP. *Bytie i nichto. Opyt fenomenologicheskoi ontologii*. Moscow: Respublika; 2000. 639 p.
9. Kazakov YP. *Dvoe v dekabre. Rasskazy* [Two in December. The stories]. Moscow: Molodaya gvardiya; 1966. 272 p. Russian.
10. Tyutchev FI. *Polnoe sobranie stikhotvorenii* [Complete collection of poems]. Leningrad: Sovetskii pisatel'; 1987. 563 p. Russian.
11. Tit Lukretsii Kar. *O prirode veshchei* [On the nature of things]. Moscow: Khudozhestvennaya literatura; 1983. 383 p. Russian.
12. Freud S. *Khudozhnik i fantazirovanie* [Artist and fantasy]. Moscow: Respublika; 1995. 400 p. Russian.
13. Agamben G. *Profanations*. Cambridge: Polity; 2008. 102 p.
Russian edition: Agamben G. *Profanatsii*. Moscow: Gileia; 2014. 112 p.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 29.12.2019.*
*Received by editorial board 29.12.2019.*